**Т.Ул. Апіок**

# ЗАХАДЫ ЎЛАД І ПРАВАСЛАЎНЫХ АРХІРЭЯЎ МАГІЛЁЎСКАЙ ЕПАРХІІ ПА ПЕРААДОЛЕННІ "РАСКОЛУ" (КАНЕЦ XVIII – ПЕРШАЯ ПАЛОВА XIX СТАГОДДЗЯ)

Стараабрадцы з'явіліся на беларускіх землях у канцы XVII ст. з часоў заснавання Веткаўскай слабады. Адбылося гэта пасля выгнання іх з украінскіх (старадубскіх) земляў па ўказу царэўны Соф'і і спроб "возвратить их на место их родины и обращать к православию" [1, с. 653]. Захады вярнуць раскольнікаў рабіліся і імператрыцай Елізаветай, і Пятром III, і двойчы Кацярынай II. У 1764 г., калі адбылося т.з. "другое выгнанне" стараабрадцаў. З Веткі пры дапамозе войска генерал-маёра Маслава былі перасёлены каля 20 000 чалавек. Аднак многія з стараабрадцаў уцяклі і рассяляліся ў розных мясцінах Магілёўскай губерні. Праз некаторы час галоўным цэнтрам магілёўскіх раскольнікаў стаў г. Беліца ў Гомельскім павеце і блізкія да яго слабоды Чарнігаўскай губерні. Па звестках спецыяльнай ведамасці рэктара Магілёўскай духоўнай семінарыі, архімандрыта Магілёўскага Богаяўленскага манастыра Іоасафа ад 1802 г., толькі ва ўладаннях графа Р.П.Румянцава ў стараабрадніцкіх прыстанках жыло больш за 300 раскольнікаў. Называюцца: Лаўрэнцеўскі, Іоасафаўскі, Пыханскі і Тырлаўскі манастыры, скіты каля Агародні, Чыстыя лужы і інш. Паведамляецца і пра раскольніцкія манастыры, капліцы са званамі і высокімі агароджамі на землях іншых уладальнікаў [2,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

с. 31]. І ў сярэдзіне XIX ст. найбольш шматлікія групы старaабрадцаў жылі ў Гомельскім павеце. Яны складалі звыш 11 % ад усяго насельніцтва [3, с. 475].

Сярод стараабрадцаў Магілёўскай губерні пераважалі папоўцы (ці беглапапоўцы). Яны былі аб'яднаны ў веткаўскі, епіфанеўскі і дыяканаўскі толкі. Жылі ў губерні і беспапоўцы філіпаўскага толку.

Адзін з найбольш пашыраных у Магілеўскай губерні толкаў – Веткаўскае "согласие", адрозніваўся ад іншых тым, што мірапамазанне веткаўцы здзяйснялі ўласным мірам, а перахрышчвалі перайшоўшых да іх з праваслаўя святароў і міран без пагружэння ў ваду. Сярод іншых асаблівасцей: "а) принимают иконы, писаные и не единоверными с ними художниками; б) сообщаются в пище и питии с православными… и не считают грехом ходить вместе с ними в баню; в) попы их, во время отсутствия своего, избирают мирян и предоставляют им право принимать переходящих в их веру…, исповедовать…; г) венчают в избах и клетях; д) запасные дары евхаристии дают монахам и мирянам…" [1, с. 675 – 676].

Кансерватызм у рэлігійных пытаннях не перашкаджаў стараабрадцам імкнуцца да поспехаў у справах, якія прыносілі матэрыяльны дабрабыт. І сярод стараабрадцаў Магілёўскай губерні былі багатыя купцы, якія вялі гандаль на сотні тысяч рублёў. Веткаўскія купцы, напрыклад, гандлявалі хлебам, соллю і лесам. Дробныя гандляры прадавалі рыбу, алей, свечкі. Займаліся стараабрадцы і рознымі рамёствамі і промысламі. У "Опыте описания Могилёвской губернии" згадваюцца "судовщики, лоцманы, извозчики, плотники, каменщики, красильщики…" [1, с. 669]. Значная частка стараабрадцаў губерні займалася земляробствам, многія – агародніцтвам на ўласных і арэндаваных землях.

У канцы XVIII – першай палове XIX ст. урадам было выдадзена шмат пастаноў аб раскольніках. Так, у 1797 г. быў афіцыйна забаронены пераход праваслаўных у "раскол". У 1805 годзе выдадзены загад аб увядзенні метрычных кніг у стараабрадніцкіх паселішчах. З 1812 г. стараабрадцам дазвалялася мець святароў толькі выбраных епархіяльнымі архірэямі. Па распараджэнню *1829* г. усе губернатары забяспечваліся "выпiскамі з высачайша зацверджаных пастаноў аб раскольніках". З *1830* г. забараняўся ўезд у Расію замежных

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

стараабрадцаў. Гэтай жа пастановай прадугледжвалася стварэнне сакрэтных камітэтаў па справах раскольнікаў. У складзе камітэтаў - епархіяльныя архірэі, губернатары, старшыні палаты дзяржаўных маёмасцей і жандармскія штаб-афіцэры. У Магілёўскай губерні такі камітэт пачаў дзейнічаць з 18 красавіка 1847 г. [5, с. 173 - 177]. А ў сярэдзіне XIX ст. быў утвораны асобы камітэт для перагляду пастаноў аб раскольніках. Так, крок за крокам, улады імкнуліся "если не к совершенному уничтожению, то по крайней мере к уменьшению как религиозного их значения, так и политической важности главнейших и могущественнейших их толков" [5, с. 163].

У канцы XVIII – першай палове XIX ст.ст. Магілёўскую епархію ўзначальвалі епіскапы: Анастасій (Братаноўскі); Варлаам (Шашыцкі); Даніiл (Мірдамскі); Іосіф (Стрэценскі); Павел (Мораў); Гаўрыіл (Гарадлоў); Смарагд (Крыжаноўскі); Ісідор (Нікольскі); Анатоль (Мартыноўскі). Амаль усе яны як адзін са сродкаў умацавання і ўзвышэння праваслаўя разглядалі захады па змяншэнні ўплыву раскольнікаў. Так, архіепіскап Анастасій (Братаноўскі) не толькі вывучаў гісторыю "расколу" і напісаў "Рассуждения о раскольниках российской церкви", але і актыўна падтрымліваў т.з. адзінаверскі рух. У "Материалах для истории раскола старообрядчества в Могилевской губернии конца XVIII – начала XIX столетий" змешчаны звесткі аб падтрымцы архіепіскапам "прошений" ад інакаў Аўксенція і Канстанціна і іераманаха Давіда "о присоединении к св. церкви" і вызваленні іх ад падушнага акладу і плацяжоў за зямлю. Па хадайніцтву архіепіскапа Св. Сінод прыняў адпаведную пастанову: "Лаврентьев, Чонский и Спасовой слободы мужской и женский и прочих жителей гор. Белицы, по желанию их, причислить к екатеринославской епархии... с дачей им... священников и с позволением службу Божию отправлять по старопечатным книгам и их обрядам" [2, с. 25]. Спробы замацаваць адзінавер'е не заўсёды мелі станоўчыя вынікі. Веткаўцы, напрыклад, у 1801 г. адмовіліся прыняць замест беглага папа Максімава "другого способного и достойного к сему званию" [2, с. 27; 6, с. 131].

Добра ведаў стараабрадніцкія манастыры, скіты, капліцы і епіскап Смарагд. Па яго хадайніцтве ў 1839 г. Св. Сінод упершыню прызначыў спецыяльных місіянераў для вяртання раскольнікаў Магілёўскай епархіі ў праваслаўе. Не спыняўся епіскап і перад больш рашучымі мерамі. Па яго распараджэнні ў тым жа 1839 г. Беліцкая стараабрадніцкая капліца з убранствам і



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

званамі была пераўтворана ў праваслаўную царкву. А раскольнікаў, якія пасля закрыцця капліцы праводзілі патаемныя сходы ў доме мешчаніна Шведава, крымінальны суд Магілёўскай палаты прысудзіў да арышту [7, с. 164, 168 ].

Выкарыстоўваў у барацьбе з "расколам" меры паліцэйскага характару і епіскап Анатоль. Ён таксама закрываў капліцы, згаджаўся на арышты і прыцягненне стараабрадцаў да суда. Аднак увага надавалася і мерам духоўнага ўздзеяння: гутаркам аб веры ў паселішчах раскольнікаў, літургіям у храмах гэтых мясцін. Епіскап Анатоль быў аўтарам шматлікіх пастарскіх пасланняў для "Христианского чтения" і асобных выданняў. За час яго епіскапства амаль 1000 стараабрадцаў далучыліся да праваслаўнай царквы. У тры разы да сярэдзіны XIX ст. зменшылася і веткаўская стараабрадніцкая федэрацыя. Аднак і ў сярэдзіне XIX ст. у Магілёўскай епархіі было 28 капліц стараабрадцаў, а па афіцыйным падліку 1847 г., у Магілёўскай губерні жылі 14349 папоўцаў і 329 раскольнікаў-беспапоўцаў [7, с. 200-203; 8, с. 47; 9, с. 59; 3, с. 475].

1. Опыт описания Могилевской губернии. Книга 1. Могилев на Днепре, 1882.
2. Могилевская старина. Выпуск 3. Могилев на Днепре, 1903.
3. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. Мн., 1989.
4. Могилевские епархиальные ведомости. 1898. №25.
5. Кильсиев В. Сборник правительственных сведений о раскольниках. Лондон, 1861.
6. Могилевские епархиальные ведомости. 1905.
7. Могилевская епархия. Историко-статистическое описание. Т. 1. Вып. 2. Ч. 2. Могилев, 1910.
8. Бейлькін Х. Веткаўскія раскольнікі // Беларуская мінуўшчына. – 1995. №2.
9. Гарбацкі А. Гісторыя старабрадніцтва Магілеўшчыны ў канцы XVIII – першай палове XIX стст. // Веснік Магілеўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.Куляшова. 1992. №1(2).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова